Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Дэма-версія практычнага задання для экзамена па гісторыі Беларусі, для навучэнцаў 9-х класаў (2022/2023 навучальны год). Білет 18. Варыянт 6**

# Білет № 18. Практычнае заданне. Культура Беларусі ў XIX - пачатку XX ст. Умовы і асаблівасці фармавання беларускай нацыі.

**Распрацоўнікі заданняў:**
Хомчанка Жанна Уладзіміраўна, ДУА «Мазалаўская сярэдняя школа» Мсціслаўскага раёна
Галакціёнава Святлана Юр'еўна, ДУА «Сярэдняя школа № 2 г.Мсціслаўля»
Камісарава Іна Валер'еўна, ДУА «Разанцаўская сярэдняя школа» Мсціслаўскага раёна
Шчура Таццяна Уладзіміраўна, ДУА «Хадосаўская сярэдняя школа» Мсціслаўскага раёна

**На аснове прадстаўленых матэрыялаў адкажыце на пытанні.**

1. Якая мова выклікала у простых людзей радасць і ажыўленне? Выкарыстоўвайце для адказу крыніцу 3.

2. Ахарактарызуйце нацыянальны склад насельніцтва Беларусі, выкарыстоўваючы крыніцу 1. Што сведчыць аб фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці жыхароў беларускіх зямель? Крыніца 3.

3. Уважліва разгледзьце крыніцу 2 – першы нумар газеты “Наша Ніва”: дзе і калі выходзіла гэтая газета, хто кіраваў яе выданнем? У чым заключалася галоўная задача газеты?

4. Прааналізаваўшы ўсе крыніцы, вызначыце ў чым заключаецца беларуская нацыянальная ідэя? Хто ўпершыню даў тэарытычнае абгрунтаванне беларускай нацыянальнай ідэі і адыграў значную ролю ў яе фармаванні і развіцці?

**Крыніца 1**

Нацыянальны склад насельніцтва Беларусі па перапісе 1897 г.

Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі




**Крыніца 2.**
Газета "Наша ніва"



Цэна асобнаго нумэру 5 кап.

Год VI. Вільня 6 Студня (Января) 1911 г. № 1.

НАША НІВА

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА З РЫСУНКАМІ

Выходзіць што тыдзень рускімі і лацінскімі літэрамі.

Адрэс рэдакціі і адміністрацііі: Вільня, Віленская вуліца, д. № 20

Цэна з перэсылкай і дастаўкай да хаты: на 1 г.—2 р. 50 к„ на 6 мес. — 1 р. 25 к., на 3 м.—65 к., на 1 мес. — 25 к. За границай: на 1 г. — 4 р., на 6 мес. —2 р., 3 мес. —1 р. Перэмена адрэсу — 20 кап.

Хто не здалее адзін плаціць за „Нашу Ніву", хай знойдзе ешчэ колькі людзей і выпішэ газэту хаўрусам.
Хто спагадае справе адраджэньня нашаго народу, нехай падтрымае нашу працу і падпішыцца на „Нашу Ніву".

VI год выданьня Прыймаецца падпіска год выданьня VI

НА 1911 ГОД

— НА ЕДЗІНУЮ БЕЛАРУСКУЮ ГАЗЭТУ —

„НАША НІВА"

Хто жадае лепшай долі беларускаму народу нехай выпісывае, чытае сам і шырыць між людзей, беларускую газэту.

Каштуе з дастаўкай і перэсылкай:
На ўвесь год толькі . . . . . . 2 руб. 50 кап.
На поўгода . . . . . . . . . . . 1 „ 25 „
На 3 месяцы . . . . . . . . . — „ 65 „

Хто вышле грошы адразу за ўвесь год, дастане у прыдатку Беларускі календар на 1911 год, а за прыплату 50 кап. „Гісторыю Беларусі" Власта.

**Крыніца 3**

Беларуская мова стала пранікаць у канфесійнае асяроддзе. Асобныя святары мясцовага паходжання прыходзілі да пераканання, што трэба размаўляць з народам на яго роднай мове, а не толькі на рускай, якой карысталася праваслаўная царква, ці ў польскім каталіцкім касцёле.Пра ўспрыманне

вернікамі такой спробы ў Дзісенскім касцёле ў 1917 г. расказаў ва ўспамінах ксёндз Адам Станкевіч: “Пачуўшы словы мовы роднай, так пагарджанай дагэтуль, твар слухачоў ажывіўся, заяснеў. Наступіла святая цішыня. Скурнае слова слухачы, здаецца, жывцом глыталі. Узрушэнне маё сардэчнае хутка ўдзялілася ўсёй велізарнай грамадзе слухаючых, і нямую ціш у касцёле замяніў нічым не ўтрыманы плач галосны. Ліліся слёзы ручаем з вачэй гаротнага, паднявольнага беларуса…”